АРК


# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

**№ 4(50) 2006**

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія



*Галоўны рэдактар:*
П. Дз. Кухарчык

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік


Весці БДПУ №4(50) сер 2.

# Змест

## *Гісторыя*


*Бушчык Г. П.* Унутрысаюзныя сувязі БССР па ўвозе і вывазе прамысловай прадукцыі ў 70—80-я гг. XX ст. ........ 3

*Барабаш Н. В.* Віды і формы міграцыйных працэсаў у БССР у першыя пасляваенныя гады (1945—1950-я гг.) ........ 9

*Якаўчук В. І.* Аднаўленне і развіццё пажарнага добраахвотніцтва Беларусі ў пасляваенныя гады (1944—1957 гг.) ........ 12

*Юрчак Дз. В.* Беларуска-ўкраінскае двухбаковае супрацоўніцтва ў галіне культуры, навукі і адукацыі ў 1991—2004 гг. ........ 15

*Пуцік У. С.* Падзенне ролі Рускай Праваслаўнай Царквы ў сацыяльнай сферы і рост яе палітычнай актыўнасці ў Беларусі ў пачатку XX ст. ........ 19

*Дрывень І. І.* Дзейнасць франтавых камітэтаў УЗС і УСГ па аказанні дапамогі арміі і насельніцтву ........ 23

*Шкуцько Л. Л., Драздова К. А.* Станаўленне капіталістычных банкаў на тэрыторыі беларускіх губерняў у другой палове XIX — пачатку XX ст. ........ 27

*Пракаповіч Л. Э.* Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі фабрычна-заводскай прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX ст. ........ 31

*Сянькевіч А. І.* Барацьба са злачыннасцю падлеткаў у канцы XIX — пачатку XX стст. і яе сувязь са станаўленнем заканадаўства аб ахове правоў дзіцяці ........ 35

*Доўнар Л. А.* Крэдытная палітыка савецкай дзяржавы адносна прыватнай вытворчасці ў Беларусі перыяду НЭПа ........ 38

*Крывіцкі Д. С.* Дыскрэдытацыя партызанскага руху ў Беларусі германскімі спецслужбамі: лжэпартызанскія атрады ........ 43

*Вінніца Г. Р.* Выратаванне яўрэяў Праведнікамі на акупіраванай тэрыторыі Усходняй Беларусі ........ 46

*Старычонак В. В.* Эвалюцыя амерыканскай грамадскай думкі па пытанні аб пачатку вайны супраць Ірака (жнівень 1990 — студзень 1991 г.) ........ 49

*Варывончык І. В.* «Неакансерватыўная рэвалюцыя» Рональда Рэйгана ........ 54

*Цзян-Шу-і.* Праблема Тайваня ў савецка-кітайскіх адносінах (другая палова 40-х — 50-я гг. XX ст.) ........ 58


## *...асофія*


*...сюк У. Ф.* Феномен чалавека: адзінства цэласнасці ...чнасці ........ 63

*...яцюк В. В.* Беларускі менталітэт як аснова грамадзянскай ...здомасці ........ 67


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

саў, да сцвярджэння здаровага ладу жыцця і новых прыярытэтаў у адносінах да кошту чалавечага жыцця, выхавання ў насельніцтва асабістай адказнасці за ўласнае здароўе; з ведамі, якія вымяраюцца доляй адукаванага дарослага насельніцтва і сукупнай агульнай доляй вучняў пачатковых класаў і навучэнцаў вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, а таксама з прыстойным узроўнем жыцця, што вызначаецца паказчыкам ВУП на душу насельніцтва.

Толькі на аснове гэтых параметраў магчыма далейшае развіццё стваральных здольнасцей чалавека, удасканаленне і больш эфектыўнае выкарыстанне яго прафесійна-кваліфікацыйнага і творчага патэнцыялу.

ЛІТАРАТУРА

1. *Аширова, Г. Т.* Современные проблемы оценки человеческого капитала / Г. Г. Аширова // Вопросы статистики. — 2003. — № 3.
2. *Базылева, М. Н.* Человеческий капитал как фактор экономического роста / М. Н. Базылева // Вестник Полоцкого государственного университета. — 2005. — № 8.
3. Статистический ежегодник Республики Беларусь, 2005. — Минск, 2005.
4. Цели в области развития, сформулированные в Декларации тысячелетия: межгосударственная договоренность об избавлении человечества от нищеты // Доклад о развитии человека за 2003 год. — Минск, 2003.
5. *Шахотько, Л. П.* Проблемы демографического развития Республики Беларусь и пути их решения / Л. П. Шахотько // Экономика. Право. Управление. 2003.

*SUMMARY*

*The main resource is analized yt's a ner economic — humane capital, the distinative peculiaritu of which is men's ability to themenbal work and innovations. A gradual entry of the Republic of Belarus in a new sistem of relabionship is shown.*

УДК 338:37

***Л. С. Кавальчук***

## АДУКАЦЫЯ ЯК ФАКТАР САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

Адукацыя з даўніх часоў адносіцца да важнай сферы чалавечай дзейнасці, якая забяспечвае сацыяльны прагрэс. Але на працягу многіх стагоддзяў яна не была непасрэдна звязана з вытворчасцю і не вылучалася ў самастойную галіну.

Па ацэнцы ЮНЭСКА, на рубяжы XIX—XX стст. ва ўсім сусвеце работнікі асветы вырашалі перш за ўсе педагагічныя і культуралагічныя задачы. Эканамічная функцыя адукацыі яшчэ не праявілася, таму што ў мінулых стагоддзях у развітых краінах Еўропы пераважала звычайная фізічная праца. У Велікабрытаніі, напрыклад, яна забяспечвала ў сярэдзіне XIX ст. існаванне прыкладна 2/3 усяго насельніцтва [3, с. 12]. Прадпрымальнікі мелі магчымасць наймаць неабходную працоўную сілу ў гатовым выглядзе, а расходы на яе навучанне і падрыхтоўку былі такімі невялікімі, што не ўлічваліся ні ў бухгалтарскіх кнігах прадпрыемстваў, ні ў тэарэтычных даследаваннях эканамістаў той пары.

Ва ўмовах сучаснай навукова-тэхнічнай і інфармацыйнай рэвалюцыі значна ўзрасла роля адукацыі ў развіцці грамадскай вытворчасці і ў станаўленні сучаснай цывілізацыі. Па ацэнцы расійскіх даследчыкаў (В. П. Шчацінін, Н. А. Храменкаў, Б. С. Рабушкін), у нашыя дні ў развітых краінах звыш паловы эканамічна актыўных грамадзян заняты не фізічнай, а разумовай працай.

Да ліку важнейшых сучасных эканамічных заканамернасцей, уласцівых розным краінам, адносіцца працэс інтэлектуалізацыі эканомікі і іншых бакоў сацыяльнага жыцця. Праяўляецца гэты працэс двойчы: узрастае роля такіх галін сацыяльнай сферы, як адукацыя і навука; умацоўваецца значэнне інтэлектуальнай дзейнасці ўнутры іншых галін народнай гаспадаркі. Абедзве гэтыя тэндэнцыі садзейнічаюць фарміраванню і ўдасканаленню адукацыйнага, прафесійнага, навуковага, духоўнага патэнцыялу грамадства і з'яўляюцца важнейшымі фактарамі сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Зыходзячы з артыкула 2 Закона аб адукацыі Рэспублікі Беларусь, адукацыя вызначаецца як «працэс навучання і выхавання ў інтарэсах чалавека, грамадства, дзяржавы, накіраваны на захаванне, прымнажэнне і перадачу ведаў новым пакаленням, задавальненне патрэб асобы ў інтэлектуальным, культурным, маральным, фізічным развіцці, на падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў для галін эканомікі» [1, ст. 2].

Толькі аб'ект «адукацыя» мае мноства бакоў, могуць быць рознымі і яго азначэнні. Адукацыя выступае ў самых розных іпастасях. Яна шматфункцыянальная, таму што выконвае роз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ныя ролі. Сярод функцый, якія выконвае адукацыя, выдзяляюцца наступныя: пазнавальная, выхаваўчая, гуманізацыі, культурнага наследавання, развіваючая, пераўтвараючая, прагнастычная, каардынацыйная, адаптыўная, прафарыентацыйная, падрыхтоўкі да працоўнай, грамадска-палітычнай дзейнасці, да сямейнага жыцця і інш.

Функцыі адукацыі ўзаемазвязаны і ўзаемадзейнічаюць у разнастайных варыянтах. Вызначаецца гэта тым, што яна як складаны сацыяльна-эканамічны арганізм адначасова выступае ў выглядзе адзінства чатырох яго якасцей: адукацыі як каштоўнасці, як працэсу, як сістэмы і як яго выніку.

Аб'ектыўна адукацыя адносіцца да ліку вышэйшых каштоўнасцей чалавека і грамадства, паколькі яна выступае прадпасылкай іх існавання і развіцця. Менавіта ў сферы адукацыі паслядоўна фарміруюцца здольнасці і жыццёвыя імкненні ўсяго насельніцтва, якія вызначаюць лёс любой краіны на многія дзесяцігоддзі наперад.

Адна з карэнных асблівасцей сферы адукацыі заключаецца ў тым, што тут цесна пераплятаюцца эканамічныя, педагагічныя, іншыя сацыяльныя працэсы. Па-першае, сфера адукацыі — самая вялікая па колькасці занятага насельніцтва. Па-другое, чалавек гэтай сферы аддае амаль трэць усяго свайго жыцця. Па-трэцяе, у перыяд знаходжання ў гэтай сферы ажыццяўляецца сталенне і станаўленне асобы, пазнанне свету і магчымасцей жыццезабеспячэння. Па-чацвёртае, гэта сфера паслуг. Па-пятае, тут існуюць спецыфічныя элементы эканомікі, якія адрозніваюцца ад элементаў іншых сфер або сфер гаспадаркі. Названыя асаблівасці абумоўліваюць самастойны змест сферы адукацыі [5, с. 5].

Нярэдка пад адукацыяй разумеюць адначасова і працэс, і вынік навучання. Вызначаецца адукацыя таксама і як вынік засваення сістэматызаваных ведаў, уменняў, навыкаў і выхавання адпаведных псіхалагічных, духоўных і іншых сацыяльных якасцей асобы.

Варта адзначыць, што адукацыя непазбежна мае сацыяльны змест і накіраванасць. Прычым сам педагагічны працэс не самамэта, а сродак дасягнення карэнных сацыяльных мэт асобы і грамадства.

Галоўная мэта і каштоўнасць адукацыі — задавальненне патрэбы людзей у ведах, уменнях і навыках у інтарэсах паспяховага развіцця духоўных сіл і здольнасцей, творчага патэнцыялу асобы і грамадскага прагрэсу ў цэлым [4, с. 10].

У айчынай і замежнай навуковай і вучэбнай літаратуры па пытаннях адукацыі менш за ўсё ўвагі ўдзяляецца галіноваму аспекту, эканамічнаму падыходу да характарыстыкі сістэмы адукацыі. Між тым яе эканамічная роля з'яўляецца адной з важнейшых, асабліва на сучаснай ступені развіцця цывілізацыі.

Эканамічнае прызначэнне адукацыі звычайна бачаць у яго актыўным уздзеянні на развіццё вытворчых сіл краіны, на павышэнне эфектыўнасці грамадскай працы.

Відавочным фактарам эканамічнага росту быў і застаецца чалавек як носьбіт працоўнай сілы — стрыжань асабістага фактару вытворчасці. Яму належыць рашаючая роля ў сістэме вытворчых сіл: менавіта людзі ствараюць сродкі вытворчасці, прыводзяць іх у рух і паляпшаюць дзеля таго, каб прымнажаць жыццёвыя даброты.

Такім чынам, разлікі паказваюць, што адукацыя — найбольш спажываемая частка выдаткаў грамадскай гаспадаркі; адукацыя і навука, якая ад яе залежыць,— галоўныя фактары росту нацыянальнага даходу і багацця, адукацыя непасрэдна звязана з вытворчасцю: залежыць ад яе і абумоўлівае яе; законы вытворчасці ўключаюць у сябе і законы ўзнаўлення працоўнай сілы (чалавечага капіталу). Таму адукацыя не можа існаваць адасоблена ад гаспадарчай дзейнасці [5, с. 10].

Адукацыя адносіцца да той сферы жыццядзейнасці людзей, дзе ўзнаўляюцца здольнасці работніка да працы, набываюцца агульнаадукацыйныя і спецыяльныя веды, фарміруюцца маральна-псіхалагічныя адносіны да працы.

Выключная важнасць эканамічнай функцыі адукацыі заключаецца ва ўзнаўленні кваліфікаванай працоўнай сілы для ўсіх галін народнай гаспадаркі. У гэтым сэнсе адукацыю можна правамерна разглядаць у якасці «падрыхтоўчага цэха для ўсёй эканомікі краіны» [4, с. 27].

Але ўзнаўленнем кваліфікаванай працоўнай сілы эканамічная функцыя адукацыі не вычэрпваецца. Галоўная яе роля заключаецца ў задавальненні патрэб людзей у адукацыйных паслугах. Менавіта таму яна займае вельмі важнае і разам з тым асобае месца. Адукацыя ахоплівае спецыфічную галіну народнай гаспадаркі, якая задавальняе патрэбы грамадства ў адукацыйных паслугах, занята падрыхтоўкай кадраў, фарміраваннем іх ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для разнастайных відаў працоўнай і іншай дзейнасці.

Адукацыя як галіна ўяўляе сабой сістэму адукацыйных устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў, якія ажыццяўляюць галоўным чынам адукацыйную дзейнасць, накіраваную на задавальненне разнастайных патрэб насельніцтва ў адукацыйных паслугах і падрыхтоўку кваліфікаванных работнікаў [4, с. 31].

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Адукацыйная галіна ў сучасных умовах мае найбольшыя інтэграцыйныя ўласцівасці. Яна адносіцца да сацыяльнай сферы адзінага народнагаспадарчага комплексу, якая ахоплівае ўвесь эканамічны арганізм краіны.

Такім чынам, адметная роля сферы адукацыі тлумачыцца: па-першае, спецыфічным месцам адукацыі ў сістэме грамадскага раздзялення працы. Гэта адзіная галіна, якая задавальняе запыты насельніцтва ў адукацыйных паслугах і спецыялізуецца на ўзнаўленні галоўнай вытворчай сілы грамадства — кваліфікаваных работнікаў для ўсіх галін матэрыяльнай і нематэрыяльнай вытворчасці, а таксама для разнастайных кірункаў невытворчай дзейнасці.

Па-другое, узровень адукацыі насельніцтва з'яўляецца адным з галоўных паказчыкаў дабрабыту народа краіны. Сам жа ўзровень дабрабыту, па меркаванні экспертаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, лепш за ўсё адлюстроўваецца з дапамогай індэкса развіцця чалавечага патэнцыялу. Ён вызначаецца трыма асноўнымі крытэрыямі: сярэдняй працягласцю жыцця, узроўнем адукацыі, памерамі даходаў на душу насельніцтва. Эксперты ААН у 1991 г. адзначылі, што былы Савецкі Саюз па гэтым паказчыку знаходзіўся б на 33 месцы сярод краін сусвету. У 1996 г. Расія па індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу апынулася на 57 месцы пасля Чылі, Фіджы і інш [4, с. 32].

Сярод краін СНД па індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу ў 2001 г. на 57 месцы апынулася Беларусь, на 62 — Расія, на 78 — Украіна [2, с. 20]. У 2005 г. Рэспубліка Беларусь займала 67 пазіцыю, Расія — 62, Украіна — 78 пазіцыю з 177 краін свету [6, с. 3].

Як адзначаецца ў навейшых даследаваннях, звычайна даўжэй жывуць людзі, якія атрымалі вышэйшую адукацыю, маюць высокія заробкі і дасягнулі значнага становішча ў грамадстве [4, с. 32]. Чым вышэй інтэлект чалавека, чым больш markrознабакова ён адукаваны, тым больш у яго магчымасцей стварыць сабе аптымальныя ўмовы для працы.

Кожны дадатковы год вучобы, лічаць навукоўцы, працягвае жыццё, самае меншае на некалькі гадоў [4, с. 33].

Па-трэцяе, гэта галіна сама для сябе рыхтуе прафесійных работнікаў — выкладчыцкія кадры. Настаўнікі і прафесарска-выкладчыцкі састаў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў адносяцца да работнікаў высокакваліфікаванай і кваліфікаванай інтэлектуальнай працы. Для прафесіянала-педагога навучанне і выхаванне навучэнцаў не пабочная, а асноўная сфера дзейнасці.

Па-чацвёртае, праца ў галіне адукацыі стала адным з самых масавых відаў чалавечай дзейнасці, пачынаючы з ранняга дзяцінства аж да завяршэння працоўнай біяграфіі, значнай часткі работнікаў. Па колькасці занятых людзей гэта сфера пераўзыходзіць любую іншую галіну народнай гаспадаркі.


Літаратура

1. Закон аб адукацыі Рэспублікі Беларусь.
2. Статыстычны партрэт Беларусі: стат. зб. — Мінск, 2001. — 140 с.
3. *Шчацінін, В. П.* Навуковыя падыходы да эканомікі адукацыі / В. П. Шчасцінін // Педагогіка. — 1996. — № 1. — С. 12—17.
4. *Шчацінін, В. П., Храменкаў, Н. А., Рабушкін, Б. С.* Эканоміка адукацыі / В. П. Шчасцінін, Н. А. Храенкаў, Б. С. Рабушкін. — М.: Расійскае пед. агенцтва, 1998. — 308 с.
5. Эканоміка і кіраванне ў сферы адукацыі / пад агул. рэд. М. Ф Грышчанка, Б. А. Татарынава. — Мінск: «ВУЗ-ЮНИТИ», 1999. — 298 с.
6. Głos z kraju i ze świata. 16 września 2005г.



Summary

*In the article education is considered as a multilateral and multipurpose field of activity of people for which the interlacing of economic, pedagogical and other social processes is characteristic. The basic aspects of education are analysed as significant sphere of human activity which provides social progress.*


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*УДК 338:37*